Санаціна № 2 для фагота і фартэпіяна М.І.Аладава складаецца з 2-х частак: андантэ і аллегро. М.І.Аладаў не выкарыстоўвае народныя мелодыі, але ўвесь "дух" твора беларускі, слухая яго не скажаш, што гэта музыка расійская ці украінская, бо, наўвогуле, уся творчасць М.І.Аладава засноўваецца на беларускім меласе.

## АНСАМБЛЕВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА У БЕЛАРУСІ

Л.К.Валасюк

Ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах у Беларусі існуе і развіваецца ў некалькіх напрамках. Гэта як прафесійныя, аматарскія, самадзейныя калектывы, так і вучэбныя ансамблі пры навучальных установах, пачынаючы з ДМШ і да вышэйшых устаноў.

У рэспубліцы створана шырокая сетка музычных школ і вучылішчаў, школ і вучылішчаў мастацтваў, музычных студый і гурткоў культурна-асветных устаноў, агульнаадукацыйных школ з музычным, эстэтычным ухілам. Ва ўсіх навучальных установах абавязкова ёсць прадмет "Клас ансамбля". Заняткі ў класе ансамбля пашыраюць музычныя веды вучняў, садзейнічаюць выпрацоўцы і замацаванню пачуцця рытма, музычнай памяці, прывіваюць навыкі ігры ў калектыве без дырыжора, раскрываюць багатыя магчымасці ансамблевай ігры ў пазнанні класічнай, народнай музыкі, выхоўваюць пачуцце арганічнай патрэбнасці ігры ў калектыве.

У вучэбных ансамблях у працэсе навучання найбольш выкарыстоўваюцца дуэты, трыа, як аднародныя, так і змешаныя па саставу. Гэта прызнаныя, вызначыныя формы, якія маюць свае выканаўчыя традыцыі, заснаваныя на народна-інструментальнай творчасці. Паміма традыцыйных саставаў - дуэтаў і трыа - у вучэбнай рабоце ужываюцца квартэты, квінтэты, секстэты і змешаныя ансамблі. Узровень музычнай падрыхтоўкі выканаўцаў даволі высокі, добра валодаючы сваім асноўным інструментам, музыканты асвойваюць і іншыя і іграюць на некалькіх інструментах. Так у інстытуце культуры на кафедры народна-інструментальнай творчасці, існуюць ансам-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

блі розных саставаў, дзе студэнты авалодваюць навыкамі ігры на некалькіх музычных інструментах, што дае магчымасць пашырыць рэпертуар, а таксама, шматкаляровыя фарбы гучання.

У цяперашні час у мастацкай самадзейнасці больш распаўсюджваецца ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах, якія адрозніваюцца як па саставу, рэпертуару, так і па манеры выканання. Гэта выклікана перш за ўсе тым, што ансамбль больш мабілен, чым аркестр, больш гібкі ў засваенні праграмы, не выклікае вялікіх цяжкасцей у кіраўніка з арганізацыяй.

У практычнай рабоце кіраўнікі самадзейных аркестраў вельмі часта звяртаюцца да разнастайных формаў ансамбляў малых саставаў.

За апошнія дзесяцігоддзі састаў удзельнікаў самадзейнасці моцна змяніўся, кантынгент яго стаў больш музычна адукаваны. У многіх самадзейных калектывах іграюць музыканты з сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыяй.

Адзін са старэйшых прафесійных музычных калектываў Беларускага тэлебачання і радыё – камерна-інструментальны ансамбль – быў створаны ў 1932 годзе А.С.Сяменавым. Ён існаваў як секстэт домраў з даваеннага часу да 1971 г. Кіраўнікамі ансамбля былі Г.Лабанок (з 1938 г.), Г.Жыхараў (з 1946.г.), Л.Смялкоўскі (з 1960 г.), Я.Валасюк (з 1983 г.). Імкнучыся ўзбагаціць гучанне секстэта домраў новымі фарбамі, Л.Смялкоўскі ўводзіць у яго партытуру баян, арфу, цымбалы і ўдарныя інструменты. Калектыў у такім складзе выступае з 1971 г. і з гэтага часу носіць назву "камерна-інструментальны ансамбль Беларускага тэлебачання і радыё".

Прафесійны калектыў другога напрамку – фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі". (Аркестравая група – 9 чалавек). Яе асноўная задача – суправаджэнне харэаграфічных нумароў, але есць і ансамблевыя самастойныя нумары. Ансамбль народнай музыкі "Жывіца", цяпер "Бяседа" Беларускага радыё і тэлебачання.

Таксама пры абласных філармоніях існуюць ансамблі народных інструментаў. У Віцебску – актэт балалаек (кіраўнік Т.Шафранава), у Гомелі – квартэт баянаў, у Брэсце – ансамбль народных інструментаў (кіраўнік – А.Гарноўскі), у Мінску – дуэт баяністаў, С.Лясун – В.Пляшэвіч, трыа – С.Лясун – В.Пляшэвіч – Ткач. У Ака-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэмії музыкі трыа баяністаў В.Пісарчык - Г.Мандрус - Т.Брагінец, дуэт цымбалістак: Кавалеўская і В.Мішула і г.д. Спіс можна было б працягваць далей.

Развіцце ансамблей народных інструментаў ідзе ў дзвюх асноўных напрамках: фальклорны і акадэмічны.

Ансамблі фальклорнага напрамку вывучаюць творчасць народа, традыцыйныя формы і жанры нацыянальнай музычнай культуры.

Ансамблі рэканструяваных (удасканаленых) народных інструментаў, асноўны напрамак іх дзейнасці - прапаганда твораў, што пішуцца кампазітарамі спецыяльна для падобнага роду ансамбляў на аснове народнай музыкі, перакладанне твораў кампазітараў розных эпох і нацыянальнасцей.

На Беларусі распаўсюджаны больш ансамблі змешанага саставу, якія уключаюць як агульнараспаўсюджаныя інструменты, так і нацыянальна-этнаграфічныя.

Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да ўсе больш разнастайнага выкарыстання народных музычных інструментаў калектывамі самых розных творчых напрамкаў.

Кіраўнікі ансамблей самі робяць шмат аранжыровак народных мелодый, перакладаў розных твораў, апрацоўваюць мясцовы фальклор, маюць цесныя сувязі з беларускімі кампазітарамі. Для многіх калектываў сення характэрна спалучэнне інструментальнай музыкі са спевамі, танцам, сцэнічным рухам, гэта значыць сінтэз шматжанравага мастацтва.

У выніку можна адзначыць разнастайнае праяўленне музычна-выканаўчага майстэрства ансамблей народных інструментаў.

## СУЧАСНАЯ СТАНОВІШЧА І ПОГЛЯД НА БУДУЧЫНЮ У РАЗВІЦЦІ САМАДЗЕЙНЫХ (АМАТАРСКІХ) ДУХАВЫХ АРКЕСТРАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Ф.В.Юрцэвіч

Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь адлюстроўваецца ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці. Перш за ўсе адчуваецца гэта ў сістэме адукацыі, культуры і навукі. Алеж, сістэма мастац-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ